*10. Марцелев, С. В.* Печать Советской Белоруссии: исторический очерк / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.

*11. Павлова, С. А.* Книга и чтение в жизни партизан Белоруссии: дисс. ... канд. филол. наук: 05.25.04. / С. А. Павлова. – Ленинград, 1983. – 214 с.

*12. Пацыенка, А.М.* Мастацкая творчасць партызан і насельніцтва Беларусі ў час яе акупацыі фашыстамі / А. М. Пацыенка // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2005. – № 4. – С. 73–78.

*13. Пацыенка, А. М.* «Вокам» партызанскай перасоўкі: кінаабслугоўванне на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны / А. М. Пацыенка // Культура. – 2009. – № 18. – С. 16.

*14. Пацыенка, А. М.* Выхаванне дзяцей і падлеткаў у партызанскіх «лясных школах» у гады Вялікай Айчыннай вайны / А. М. Пацыенка, С. А. Пацыенка // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 5. – С. 76–79.

*15. Сченснович, Н. И.* Записки актера и партизана / Н. И. Сченснович; Литературная подготовка текста Алексея Кейзарова. – Минск : Беларусь, 1976. – 152 с.

*16. Юденков, А.Ф.* Политическая работа партии среди населения оккупированной советской территории (1941–1944) / А. Ф. Юденков. – М. : Мысль, 1971. – 360 с.

## ВАЙНА ПРАЗ ПРЫЗМУ МАЛАДОСЦІ: ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВОБРАЗНЫМ СЛОВАМ

***А. М. Пісарэнка,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***В. С. Варапаева,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

Сямідзесяцігоддзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне – дата надзвычай хвалюючая і трапяткая для многіх народаў свету, і асабліва для нас, беларусаў. З гэтай вайны не вярнуліся многія, і нашчадкі ўвекавечваюць памяць у творах розных відаў мастацтва, у назвах вуліц, і як пацверджанне гэтаму – помнік у горадзе Жодзіна: маці развітваецца з сынамі, якія ідуць на вайну. Ніводзін з іх не вярнуўся, і такіх недачаканых шмат. Што іх, юных і маладых хлопцаў і дзяўчат, цягнула на гэтую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вайну? Што прымушала іх кідацца пад танкі, на амбразуры кулямётаў, ісці на шыбеніцу і не выдаваць сяброў? Што ўкладвалі яны ў слова патрыятызм, ці яны ўвогуле пра гэта не думалі? Адзін цудоўны рускі пісьменнік (Радзій Пагодзін), які сам падлеткам трапіў на фронт, лічыў, што патрыятызм – гэта нармальная праява чалавечага «я». Як расказаць, паказаць, растлумачыць гэта нашай сённяшняй моладзі, якая, дзякуй Богу, жыве на нашай тэрыторыі ў мірны час? Чаму ў рэшце рэшт людзі не задумваюцца, што яны не вечныя на зямлі, што іх прызначэнне – быць стваральнікамі, а не разбуральнікамі? У адной індыйскай казцы племя прыдумала, як навекі пазбавіцца войнаў: у вялікую яміну яны скінулі і закапалі свае тамагаўкі. І так людзі вырашылі пытанне вайны. Сёння закапаць нарыхтаваную чалавекам на чалавека зброю цяжка і немагчыма, аднак можна і важна ў маладых людзей выхаваць любоў да Радзімы, адданасць праз малыя і вялікія справы.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны хвалявала і хвалюе творчых людзей розных пакаленняў: саміх ветэранаў, іх дзяцей, затым іх унукаў. Любая вайна – гэта трагедыя, гэта выпрабаванне, і гэта тая тэма, якая адлюстравана ва ўсіх відах мастацтва. Што да мастацкай літаратуры, то менавіта тэма вайны тут адлюстравана поўна, усебакова, дакладна-вобразна і эмацыянальна. На творах В. Быкава і Я. Брыля, І. Шамякіна і І. Навуменкі, А. Макаёнка і А. Дударава, П. Броўкі і Р. Барадуліна і інш. вырасла не адно пакаленне. (Творы гэтых аўтараў прапанаваны для вывучэння і студэнтам нашага ўніверсітэта.)

Мастацкі тэкст – феномен чалавечай думкі, вобразна-асацыятыўнага мыслення, адзін з арыгінальных спосабаў самавыражэння асобы, які можа стаць крыніцай натхнення пры стварэнні вобразаў сродкамі іншых відаў мастацтва: жывапісу, тэатра, кіно і г. д. Сам тэкст можа ўзнікнуць як вынік натхнення, атрыманага не толькі пасля наведвання тэатра ці музея, мерапрыемстваў, што ладзяцца творчымі кафедрамі нашага ўніверсітэта, карціннай галерэі, прагляду кінафільмаў, а таксама пасля гутаркі з роднымі, блізкімі людзьмі.

Абагулены вобраз чалавека на вайне дае магчымасць кожнаму сфарміраваць сваё бачанне, разуменне гэтай жудаснай з'явы. Якім быў чалавек на вайне, што ён адчуваў, што перажываў, пра што марыў, чаго чакаў. Зрабіць гэта маглі і могуць творцы, якія праўдзіва адлюсроўваюць рэчаіснасць, якія не баяцца забароненых тэм, а, наадварот, паказваюць, як было на самой справе. У першую чаргу, варта ўзгадаць пісьменнікаў-франтавікоў: В. Быкава, П. Панчанку, Ю. Бондарава і інш. Творы гэтых і вышэйназваных пісьменнікаў раскрывалі ўнутраны свет чалавека на вайне, матывацыю паводзін: аўтары імкнуліся да разумення таго, чаму ў канкрэтных сітуацыях чалавек дзейнічае менавіта так, а не інакш. Моладзь бачыць не паказны, а сапраўдны гераізм: *Злосна сказаў:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*«Уставай, пяхота! / Мы не на пляжы, а на вайне». / І лёг на змяіныя скруткі дроту. / І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў / Прайшлі па яго спіне.* («Герой» П. Панчанка). Ці лічыў сябе салдат героем? Думаецца, што не: гераізм асобы – жыццёвая пазіцыя, бо ён ахвяруе ўласным жыццём. У дадзенай сітуацыі малады чалавек не можа дзейнічаць інакш, ад яго залежыць жыццё або смерць іншых людзей. Менавіта ў такую сітуацыю ставіць свайго героя П. Панчанка. Гэты твор хвалюе, выклікае адпаведную рэакцыю чытачоў, слухачоў.

В. Быкаў зусім юным трапляе на фронт, а затым адным з першых у савецкай літаратуры, і ў прыватнасці беларускай, стварае ўнікальны вобраз салдата-радавога, на плячах якога быў вынесены ўвесь цяжар вайны. Якім быў гэты салдат? Гэтае пытанне хвалюе і сённяшніх маладых людзей. Адказ – у творах В. Быкава. Гэты чалавек быў розным: і героем, і здраднікам, і баязліўцам, і марадзёрам… Думка В. Быкава часам не супадала з агульнапрынятай у той час: савецкі воін – ідэал, усім сэрцам і душой адданы Радзіме. Аднак рэальнасць была іншай, і ў адной з першых аповесцей «Жураўліны крык» аўтар шчыра адлюстроўвае псіхалогію чалавека на вайне. Тут праяўлялася ўсё, чым жыў чалавек да яе пачатку: чаму, напрыклад, Пшанічны становіцца здраднікам? Рэтраспектыва, якой так часта карыстаўся В. Быкаў, дае магчымасць зразумець, як напакутаваўся гэты чалавек да вайны, бо бацькоў яго незаслужана, несправядліва пакрыўдзілі. А яму прыйшлося ўвесь час выдаваць сябе за іншага чалавека. Творы Быкава ставяць агульначалавечыя праблемы нават аднымі толькі сваімі назвамі – «Мёртвым не баліць», «Знак бяды», «Пакахай мяне, салдацік», «Сцяна» і г. д. За кожнай назвай радасць, гора, страх і нянавісць. Быкаву падуладна яскрава намаляваць розныя вобразы, перадаць разнастайныя пачуцці (чаканне, любоў да радзімы, маці, адчай, замілаванне, абурэнне і г. д.). Акцэнт на гэта пры аналізе твораў пісьменнікаў дае магчымасць самім студэнтам перанесціся ў тую атмасферу, якая была ўласціва часу. А што гэта дае ім, маладым? Па-першае, адчуць сябе ўдзельнікам тых падзей, актывізаваць сваю эмацыйную сферу; па-другое, не толькі адчуць, але і зразумець, што пра вайну, людзей нельга забываць; па-трэцяе, на сваім узроўні (чалавека XXI стагоддзя) пастарацца перадаць усё тое, што адчувалі героі Айчыннай вайны. Такім часам, пракладваецца ланцужок духоўнасці паміж рознымі пакаленнямі.

У межах літаратурнага аб’яднання ўніверсітэта «БУКет» неаднаразова ладзіліся літаратурныя конкурсы, у тым ліку да Свята Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Удзельнікамі і пераможцамі былі студэнты ўсіх факультэтаў універсітэта, а кансультанты аб’яднання і шаноўныя госці – члены Саюза пісьменнікаў – выступаюць у якасці журы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што хвалюе сучаснае пакаленне пры асэнсаванні гэтай тэмы, якія ідэалы паводзінаў дэманструе моладзь у сваіх тэкстах? Так., Г. Вярэніч прысвячае верш «Неизвестный солдат» мужнаму байцу-вызваліцелю. Абагульняльны, сімвалічны вобраз непераможнага невядома салдата, які мужна дайшоў да Берліна, дзе і загінуў, яна ставарае з дапамогай метафар і эпітэтаў: ***Холодную землю снаряды терзали***, */ И* ***воздух трещал*** *над его головой. / Он в сердце* ***запрятал подальше печали***, */ На улицах вел он* ***безжалостный бой***; *Ведь видел солдат то, что будет* ***свободной*** */ И* ***сильной*** *навеки* ***Родная страна***! */ Он верил, он видел, как в* ***стуже холодной***, */ Уж* ***вольные крылья расправит она***! Асноўная думка верша – гэта ўдзячнасць вызваліцелям за мірнае жыццё, светлае неба, а таксама любоў да Радзімы і гонар за тых, хто яе абараняў. Відавочна, што гэтыя пачуцці, як сама памяць пра вайну не згасне ў сэрцах маладых, не стане менш.

К. Ерашова ў вершы «Защитникам Родины!» звяртаецца да кожнага сучаснага чалавека: яна нагадвае, што мы ўсе адказваем за Беларусь, як кожны нашчадак адказны за спадчыну, і што абараняць Айчыну – мужчынская справа. Маладое пакаленне ганарыцца продкамі і заклікае захоўваць мір на роднай зямлі: *Родина-мать – это слово высокое / В сердце у каждого отозвалось. / Вам доверяет страна очень многое, / Чтоб сыновьям воевать не пришлось.*

Кранальны верш-балада «Играла музыка в почти безлюдном зале…» Ю. Коўшык пра тое, што нягледзячы на вайну, людзі заставаліся людзьмі са сваімі пачуццямі, марамі; у перапынках паміж баямі ўспыхвала маладое каханне: *Играла музыка в почти безлюдном зале… / Сливаясь с песнею безжалостной войны, / И девушки сидели и скучали, / Как вдруг, не постучав, вошли они… // Держа в руках победы нашей знамя, / Перед последним боем, на часок…* Праз антытэзу выяўляецца вастрыня пачуццяў як аўтаркі, так і персанажаў. Ціхая і бязлюдная зала, музыка, каханне супрацьпастаўляюцца сутнасці вайны ***(безжалостной)***. Яна, бязлітасная, не шкадуе нікога: ***бомбы рвуцца*** на грудзях зямлі, чалавецтва, а малады чалавек-абаронца ідзе ў бой, інакш быць не можа: *А я вослед, вослед ему кричала: / Постой, любимый мой, не уходи!!! / Лишь ночь безумная – одна – всё понимала, / Взрывались бомбы на её груди… // И он ушёл, открытой дверь оставил… / Она его украла у меня. /* ***Проклятая, беззубая, чужая… / Бессмысленная, глупая война!***

Верш «Гэты дзень пачынаўся не так» У. Лісоўскага (У. Козічаў) гучыць як працяг балады Ю. Коўшык: застаецца дзяўчына чакаць і не дачакаецца каханага, бо наперадзе ў салдата бой. Малады паэт нібы сам пражыў гэты момант у сваім жыцці – такі дасканалы вобраз, вывераныя штрыхі-дэталі, у якіх гучыць прага жыцця, асуджэнне вайны: *Гэты дзень пачынаўся не так, / Як бясконцыя новыя дні. / Перанесены месцы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*атак / Па-за межы зямлі. // Я* ***смяротна атручан вайной****, / Я* ***трымаюся ледзь на нагах****. / І* ***апошняе сонца ўзышло*** */ У тваіх валасах. // Што табе мае* ***тысячы ран****, / Калі свеціць твая* ***прыгажосць****. / Да мяне* ***набліжаецца рай****, / Да цябе –* ***маладосць****.* У гэтых радках прыём кантрасту адлюстроўвае ганебную сутнасць вайны: маладосць, сонца, валошкі (васількі ў вянку – усё гэта сімвалы міру, сімвалы Радзімы) супрацьпастаўляюцца тысячам ран маладога байца, прыбліжэнню раю (перыфраза да слова смерць), яго болю і празе жыцця – палёту. Ды вайна не дае выбару шчырым, смелым маладым сэрцам: толькі ў бой, толькі абараніць, нягледзячы на вялікае і вострае жаданне яшчэ не адзін раз убачыць разлівы азёр, кружыць над імі белым буслом, удыхаць пах чабору і верасу: *А як лётаюць нізка буслы, / Што, глядзі, дакрануцца крылом. / І так хочацца жыць да вясны / Гэткім самым буслом. // Бачу ў небе разлівы азёр / Ці то сінія вочы твае. / Пахне верас і пахне чабор. / Не хавайце мяне. // І гукае, плыве над зямлёй, / Нібы маці, згубіўшы сыноў, / Голас сэрца Радзімы маёй, / Голас казак і сноў.* Малады паэт цікава спалучае ў адным вершы два сімвалы Беларусі – буслы і васількі, што яшчэ раз пацвярджае яго адназначнае, моцнае і трапяткое пачуццё да Радзімы – любоў, за якое ён гатовы аддаць жыццё і аддае: *На магіле салдацкай маёй / Зацвіце прыгажун-****васілёк,*** */ Ты яго самай першай вясной / Запляці ў вянок.*

Яшчэ адно пачуццё, якое асэнсоўваюць маладыя аўтары ў сваіх творах, – гэта любоў да бацькоў, да маці. Песня «Письмо с войны» ад А.Ставінскай – ліст, напісаны юнай салдацкай рукою… І ён, гэты салдат, таксама не вернецца з поля бою; ён піша з жорсткай вайны радасны ліст сваёй маці; ён верыць у перамогу і ў вяртанне. Маладосць заўсёды верыць, аднак лёс жорсткі і бязлітасны, таму паэтка заклікае памятаць тых, хто загінуў, памятаць, каб не дапусціць, каб не паўтарыліся жахі і не згасла сонца: *Сколько таких же мальчишек / Домой не вернулось с войны? / Сколько таких, кто не дожил / До нашей победной весны? / Светлую, Вечную Память / В сердце о них сохрани.* Аўтарка акцэнтуе ўвагу на значнасці слоў *светлая / вечная / памяць* з дапамогай графічных сродкаў выразнасці – вялікай літары.

І зноў нібы адказ папярэдняму аўтару гучаць радкі «Балады вяртання» Янкі Лайкова: *Грымоты збіраліся на даляглядзе. / Чакала залевы зямля. / На пыльны гасцінец выходзіла Маці, / глядзела з-пад далані. Здаля / Плылі набрынялыя важкія хмары.* Маці чакае сына, нягледзячы на грымоты і набліжэнне навальніцы, моліцца, укленчыўшы, жагнаецца; яе боль і горыч увасобіліся ў аўтарскай метафары ***са слёзаў палын прарастаў***. Ёй прымроілася вяртанне сына, яна пачула: *Я першы вярнуўся з выгнання. / За мною – натоўпы сыноў. / За вечарам – ноч, а пасля будзе ранне… / Ён знік. Маці ўкленчыла зноў.* Маці заўсёды чакае, маці заўсё-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ды моліцца; аўтар дазваляе чытачу дадумаць фінал: магчыма ён у назве, якую нельга разумець літаральна – гэта балада невяртання. Яны, маладыя, не вернуцца, для іх галоўнае – абараніць Радзіму. Такі ідэал паводзінаў вынікае з вершаў маладых аўтараў літаратурнага аб'яднання, з твораў знакамітых аўтараў, такія паводзіны былі ў іх продкаў – інакш не магло быць, такі кошт перамогі над вайной.

На сучасным этапе развіцця грамадства цікавасць да фарміравання асобы, у тым ліку асобы студэнта, выяўленне і ўдасканаленне яго здольнасцяў, удасканаленне магчымасцяў індывіда надзвычай важнае. Якраз праз вывучэнне шэрагу дысцыплін гуманітарнага цыклу, у прыватнасці літаратурна-моўнага (філалагічнага) накірунку і адбываецца фарміраванне гарманічнай асобы. Пры вывучэнні мастацкай літаратуры фарміруецца паняцце аб найважнейшых маральна-этычных каштоўнасцях (патрыятызм, дабрыня, вернасць, спагада, чуласць і інш. рысы характару). Сучаснікі не павінны абясцэньваць ролю слова ў выхаванні чалавека, у спасціжэнні жыцця, у самарэалізацыі творчай і гарманічнай асобы. На гэта і робіцца акцэнт на кафедры беларускай і замежнай філалогіі, пры якой існуе літаратурна-творчае аб'яднанне «БУКет».

## ВОЙНА НИКОГО НЕ ОБОШЛА

***Т. В. Сернова,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры музыкально-педагогического образования*
*учреждения образования «Белорусский государственный*
*педагогический университет имени Максима Танка»*

***В. А. Черняк,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры музыкально-педагогического образования*
*учреждения образования «Белорусский государственный*
*педагогический университет имени Максима Танка»*

С первых дней Великой Отечественной войны Беларусь стала ареной ожесточенных боев Красной Армии с фашистскими захватчиками. Многие деятели культуры вступили в ряды действующей армии или пошли в партизанские отряды. Но развитие белорусского искусства не остановилось. И в далеком тылу, и в непосредственной близости от фронта белорусские музыканты работали с большим напряжением творческих сил, вносили свой посильный вклад в общее дело разгрома

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ